строительству. Всего через пять лет после окончания Гражданской войны развернулась масштабная индустриализация страны. В кратчайшие сроки были осуществлены коллективизация крестьянских хозяйств и культурная революция. Конституционное закрепление всеобщей воинской обязанности, превращение защиты социалистического Отечества в священный долг каждого гражданина окончательно определили народный характер Армии и Флота. Был обеспечен почет воинской службы.

Прочный экономический и политический фундамент, утверждение общественной собственности на средства производства создали надежную основу победы советского народа в Великой Отечественной войне. СССР устоял перед всей мощью покоренной немецким фашизмом Европы, сыграл главную роль в избавлении мира от коричневой чумы. Решающий вклад внесли советские войска и в обуздание японского милитаризма. СССР и его союзники стали оплотом мира и дружбы народов, надежным защитником угнетенных всей планеты.

Советский строй открыл широкие перспективы перед человеком. Всеобщее среднее и доступное высшее образование, бесплатное и качественное здравоохранение. И сейчас немало стран идут по пути социализма. Впечатляют экономические успехи Китая и Вьетнама. Все увереннее звучит голос сил социалистического выбора в Латинской Америке.

Столетний юбилей Великого Октября - достойный повод провести анализ событий прошлой эпохи, извлечь уроки, не повторять ошибки и стремится следовать идеалам Великой Октябрьской социалистической революции.

*Список литературы*


1. Левандовский А.А., Щетинов Ю.А. «Россия в XX веке».
2. Жарова Л.Н., Мишина И.А. «История отечества».
3. Поляков Ю.А. Великая Октябрьская. – М.: Наука, 1987.


УДК 94 (100) "1914/19"

## МЕТАФАРЫЧНЫЯ ПАНЯЦЦІ Ў ПАЭМЕ “НОВАЯ ЗЯМЛЯ” Я.КОЛАСА. ДА 135 – ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КОЛАСА

*В. В. КУРЛОВІЧ*
*Установа адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту» г. Гомель*

Паэма “Новая зямля” Я.Коласа з’яўляецца жамчужынай нашай паэзіі, арыгінальным і непаўторным творам пачатку ХХ стагоддзя. Цяжка ў якой-небудзь з паэм знайсці столькі малюнкаў, навеяных палямі, лясамі, усім, што акружае жыхара нашага краю. Паэт адчуваў, што прыгажосць беларускіх лясоў, нікім яшчэ не апетая, тоіць у сабе вялікую паэзію:

Стары, высокі лес цяністы.
Тут верх асіны круглалісты
Сплятаўся з хвоямі, з дубамі,
А елкі хмурымі крыжамі
Высока ў небе выдзялялісь,
Таемна з хвоямі шапталісь…
Лес наступаў і расступаўся,
Лужком зяленым разрываўся;
А знізу гэты лес кашлаты
Меў зелянюсенькія шаты…

[1, с.9]

Вобраз лесу ў паэме авеяны вэлюмам загадкавасці,бяскрайнасці.

Ды з гэтым бацькам адно гора!
Як пойдзе ён у лес той зрання ,
Як цукар у вадзе растане.

[1, с.19]

Кожны чалавек у паэме прызнае значнасць і каштоўнасць лесу:

А колькі зелені там летам!
Як у вяночку, стаіць хата.
Грыбоў і ягад – страх багата!..

[1, с.41]

Розныя поры года прадстаўлены ў паэме яркімі, незабыўнымі карцінамі. Меняючы малюнкі лесу паэт паказвае хуткі бег часу:

Тым часам спас святы мінуўся,
І лес у чырвань апрануўся.
Дрыжаць у золаце асіны,
І гнуцца кісці верабіны.

[1, с.105]

Адным з важныйшіх кампанентаў коласавай манеры пісьма пры апісанні лесу выступаюць стылістычныя фігуры, найбольш прадуктыўнымі сярод якіх з’яўляюцца метафары, з дапамогай якіх аўтар перадае незвычайныя па сваёй вобразнасці малюнкі.”Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў” пад рэд. М. Лазарука гаворыць: метафара (гр.metaphora – перанос) від тропа ў якім

уласцівасці адной з’явы пераносяцца на другую па прынцыпе ўпадабнення. Такім чынам, можна разглядаць метафару, як новую функцыю слова, заснаваную на пераносе назвы з аднаго прадмета на другі.

Аналіз фактычнага матэрыялу паказвае, што ў паэме “Новая зямля” Я. Коласа адносна слова “лес” выкарыстана 27 метафар.

Лес. Стары, высокі лес цяністы / *сплятаўся* з хвоямі / А елкі… *выдзялялісь* / з хвоямі *шапталісь* / Яны найбольш адны *стаялі,* / І так маркотна *пазіралі* / Лес *наступаў* і *расступаўся*, / Лужком зялёным *разрываўся [1, с. 9]; /* Старыя хвоі і яліны / *Глядзелі* хараша, любоўна *[1, с. 49]*; І лес у чырвань *апрануўся [1, с. 105];* І лес *застыў, глядзіць* гаротна *[1, с. 146]*; І лес жалобную гаворку *канчае* / І моўчкі зіму *сустракае [1, с. 152]*; Лес набожна /*Стаіць, маўчыць і ўсё святлее, /* Як бы, здаецца, *весялее [1, с. 153]* / Што лес *застогне* і *засвішча [1, с. 158]*; *Прачнуўся* лес ад бразгатання/ *Гудзе* лес зверху да карэння *[1, с. 158]*; І лес пад сіняю смугою / *Застыў, стаіць,* як амярцвелы *[1, с. 162]*; Ці гэта казку лес *складае? [1, с. 166]*; *Скідае* лес убор зімовы *[1, с. 175]*; А лес *маўчыць,* глухі, таемны *[1, с. 188]*; І лес маўкліва *азірае [1, с. 193]*; Лясок атуліць свае шаты*[1, с. 215]*; *Ачнецца* лес, *звіняць* прагалы *[1, с. 220]*; І гэты лес, смугой *засланы[1, с. 239]*;

Увогуле метафары падзяляюцца на дзеяслоўныя і назоўнікавыя. Часцей у беларускай мове сустракаюцца дзеяслоўныя метафары, бо яны нярэдка займаюць пазіцыю выказніка, якая патрэбна для злучэння двух значэнняў, што абазначаюць блізкія рысы двух прадметаў: Што лес *застогне* і *засвішча [1, с. 158]*; А лес *маўчыць,* глухі, таемны *[1, с. 188].*

Агульнапрынятае значэнне дзеяслова замяняецца кантэкстуальным. Кантэкстам дзеяслоўнай метафары з’яўляецца назоўнік: *прачнуўся* лес ад бразгатання *[1, с. 158]*; Ці гэта казку лес *складае [1, с. 166]*; Лясок *атуліць* свае шаты*[1, с. 215].*

Сярод метафарычных канструкцый сустракаюцца такія, што ўключаюць у свой склад дзеепрыслоўе ці дзеепрыметнік, якія абазначаюць дадатковае дзеянне пры асноўным перададзеным метафарызаваным дзеясловам: І лес стаіць, як *амярцвелы*, / Башлык *надзеўшы* чысты, белы *[1, с. 162]*; І гэты лес, смугой *засланы [1, с. 239].*

Апрача ўласнай метафары выкарыстоўваецца адзін з яе відаў – увасабленне. “Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў” гаворыць: увасабленне– мастацкі троп, асобны від метафары, які асноўваецца на прыпадабненні прадметаў, з’яў прыроды, паводзінам чалавека, перанясенні на гэтыя з’явы чалавечых уласцівасцяў. Найбольш пашыраны дзеяслоўныя ўвасабленні. Паводле семантыкі яны падзяляюцца на тры группы: са значэннем дзеяння, са значэннем стану, увасабленні, якія характарызуюць слыхавыя асацыяціі:

1. Увасабленне са значэннем дзеяння:

Словы азіраць, глядзець, пазіраць перадаюць агульнае ‘значэнне накіроўваць позірк куды-небудзь, каб убачыць, акінуць поглядам’: І лес маўкліва *азірае [1, с. 193]*; І лес застыў, *глядзіць* гаротна *[1, с. 146]*; А елкі… выдзяляліс/ Яны найбольш адны стаялі, / І так маркотна *пазіралі*[1,с 9].

Словы разрывацца, расступацца перадаюць агульнае значэнне ‘раскрывацца, разыходіцца ў бакі, размыкацца’: Лес *наступаў* і *расступаўся,*/ Лужком зялёным разрываўся [1, с. 9].

2. Увасабленні са значэннем стану: застыць, стаяць. Застыць ‘стаць нерухомым, замерці’, стаяць ’быць пастаўленым у вертыкальным становішчы’: *Застыў, стаіць,* як амярцвелы[1, с. 162]; Лес набожна / *Стаіць*, маўчыць і ўсё святлее [1, с. 153].

3. Увасабленні, якія характарызуюць слыхавыя асацыяцыіі: гудзець ‘ утвараць роўны, густы, працяжны гук’: Гудзе лес зверху да карэння [1, с. 158]; застагнаць ‘ пачаць стагнаць’, засвістаць ’пачаць свістаць’ : Што лес *застогне* і *засвішча* [1, с. 158]; шаптацца ‘слаба, ледзь чутно шумець’: А елкі выдзяляліс / Таемна з хвоямі *шапталісь* [1, с. 9].

Шырока выкарыстоўваюцца ў паэме параўнанні – самы ходкі троп. У “Паэтычным слоўніку” пад рэд. В. Рагойшы гаворыцца: параўнанні – такое супастаўленне двух прадметаў, з’яў, паняццяў, у выніку якога сутнасць аднаго з іх вытлумачваецца праз сутнасць другога. Параўнанне робіць паэтычны малюнак па-мастацку наглядным, жывапісным.

У паэме можна знайсці параўнанні ў склад якіх уваходзіць назоўнік *лес,* дзякуючы выкарыстанню якога аўтар падкрэслівае многія якасці лесу: вышыня і непраходнасць – Ячмень, *як лес,* расце без гною [1, с. 231]; Ой вы, дарожанькі людскія, / Пуцінкі вузкія, крывыя! / Вы следам цьмяным снуяцеся / І ўсё блукаеце, *бы ў лесе* [1, с. 280]; якасці і ўласцівасці: І сам ён хмуры, і думкі хмуры, / *Як гэты лес,* снягамі сцяты / [1, с. 146].

Часта і сам лес параўноўваецца з рознымі прадметамі і паняццямі, пры гэтым праяўляюцца наступныя ўласцівасці лесу: неабсяжнасць – Куток прыгожы і вясёлы: / *Як мора – лес,* як неба –долы [1, с. 109]; блізкасць і роднасць: Міхал у *лесе, як бы дома* [1, с. 146].

Такім чынам, метафарызацыя паняцця «лес» у паэме дае магчымасць уявіць яго як асобны свет. Ён можа сумаваць, гаварыць, г.зн. жыць такім жа, як і чалавек, жыццём. І гэта патрабуе беражлівых і паважлівых адносін да лесу, як да бясцэннага скарба, падараванага нам маці прыродай.

*Спіс літаратуры*

1 Колас Я. Збор твораў: У 14т. Т.6. – Мінск, 1974.

2 Лазарук М., Ленсу А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. – Мінск, 1996.

3 Рагойша В. Паэтычны слоўнік. – Мінск, 1987.